Марына ПЛАЎСКАЯ,
Валянціна ЦІХАНАВЕЦКАЯ

# ЯНКА КУПАЛА І КАНСТАНЦЫЯ БУЙЛО

*Сёлета ў нашай краіне святкуецца 140-годдзе з дня нараджэння першага народнага паэта Беларусі Янкі Купалы. Публікацыя раней недрукаванага зборніка Канстанцыі Буйло «Памяці друга» прысвячаецца юбілейнай даце і дазволіць сучаснікам больш глыбока зразумець творчыя працэсы мінулага стагоддзя, пазнаёміцца з паэтычнай творчасцю Канстанцыі Буйло.*



*Канстанцыя Буйло. Настаўніца. 1915 г.*

Канстанцыя Буйло — вядомая беларуская паэтка, сяброўка Янкі Купалы і яго жонкі Уладзіславы Францаўны Луцэвіч, працавала на ніве нацыянальна-дэмакратычнага адраджэння Беларусі. Канстанцыя Буйло (Канстанцыя Антонаўна Калечыц) нарадзілася 2 студзеня 1893 года ў Вільні. Сціплая дзяўчынка з мястэчка Вішнева Гродзенскай губерні з цягам часу вырасла ў выдатную паэтку, чые вершы сталі сапраўднымі народнымі песнямі. Скончыла настаўніцкія курсы ў Вільні. Менавіта тут яна пазнаёмілася з Янкам Купалам, і з гэтага часу іх шляхі не аднойчы перасякаліся. Пазней Канстанцыя Буйло настаўнічала на Лідчыне, у 1915—1916 гадах была загадчыцай полацкай беларускай кнігарні.

Пад уплывам творчасці Янкі Купалы і Якуба Коласа яшчэ ў юным узросце пачала пісаць вершы. У 1909 годзе ў газеце «Наша ніва» з'явіліся яе першыя вершы «Лес», «Хвоя», «Скора зіма». Невыпадкова Купала адразу заўважыў паэтычны дар Канстанцыі Буйло і ў 1910 годзе надрукаваў у «Нашай Ніве» цудоўны верш «Мая думка» з прысвячэннем: «Ахвярую Канстанцыі Буйло».

Як вецер, як птушка, дзе сонца, дзе зоры,
Так рвецца, нясецца ўдаль думка мая;

---

***Марына Плаўская*** *— вядучы навуковы супрацоўнік аддзела навукова-фондавай работы Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы.*

***Валянціна Ціханавецкая*** *— вядучы навуковы супрацоўнік аддзела навукова-фондавай работы Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы.*

Абыймецца з небам, пакоціцца ў мора,
Ў вялікае мора людскога жыцця…

Янка Купала старанна заахвочваў Канстанцыю да творчасці, дапамагаў парадамі, дасылаў лісты, падбадзёрваў зваротамі праз газету: «Чаму замоўклі? Чакаем вашых вершаў». У 1914 годзе выйшаў першы паэтычны зборнік Канстанцыі Буйло «Курганная кветка». Сюды ўвайшоў і першы верш-прысвячэнне Янку Купалу «Звон», напісаны ёю яшчэ да знаёмства з паэтам. У вершы гучыць захапленне паэзіяй Янкі Купалы:

…А гукі яго дзіўнай нотай дрыжалі,
То якбы ў задуме, то якбы ў жалі,
То зноў якбы звонкі прызыў.
Ён зваў да жыцця і да лепшае долі
Ўсіх тых, хто яшчэ цвёрдым
сном спаў…



*Янка Купала. Санкт-Пецярбург. 1912 г.*

Зборнік складаў і асабіста рэдагаваў Янка Купала. Працаваў паэт над ім з задавальненнем, надзвычай беражліва абыходзіўся з аўтарскімі тэкстамі, захоўваючы індывідуальны стыль паэткі. Мастацкае афармленне выканаў Язэп Драздовіч. У далейшай сваёй творчасці К. Буйло з удзячнасцю ўспамінала свайго першага рэдактара, які лічыўся з ёю як з аўтарам і не імкнуўся перарабіць усё на свой лад. Пры непасрэднай падтрымцы Янкі Купалы К. Буйло стала друкавацца ў тагачасных літаратурных выданнях і хутка атрымала высокую ацэнку сваёй творчасці сучаснікамі-літаратарамі, у тым ліку і такога патрабавальнага да сябе і іншых майстра паэтычнага слова, як Максім Багдановіч.

У свой час Максім Гарэцкі ў «Гісторыі беларускай літаратуры» адзначаў паэтычныя здольнасці Канстанцыі Буйло як «найбольш выдатнай пасля Цёткі жаноцкай сілай у нашай паэзіі». Да творчасці Канстанцыі Буйло вельмі добра ставіліся многія пісьменнікі, з якімі яна пазнаёмілася ў Вільні: Змітрок Бядуля, Якуб Колас, Максім Багдановіч, Цётка, Максім Гарэцкі, браты Іван і Антон Луцкевічы. Па меркаванні Антона Луцкевіча, «Буйла горача любіць свой край і народ, бо ня можа не любіць: каханнем сагрэта ў яе ўсё, што яна робіць, што піша».

20-30-я гады XX стагоддзя сталіся вельмі складанымі ў лёсе Канстанцыі Буйло, што не магло не адбіцца і на яе творчасці. У 1923 годзе яна пераехала ў Маскву да мужа Віталя Калечыца. У 1933 годзе ён быў арыштаваны НКУС і загінуў у засценках ГУЛАГа. Гэта трагічная падзея, цяжкае матэрыяльнае і маральнае становішча (яна адна гадавала маленькага сына), адрыў ад бацькаўшчыны, ад беларускага літаратурнага асяроддзя не маглі не сказацца на яе творчасці. Сувязь з Беларуссю яна падтрымлівала толькі праз Янку Купалу і Уладзіславу Францаўну, жонку паэта, якая ўсё жыццё была ёй і сяброўкай, і сястрой. Пазней Канстанцыя адзначала: «Я мала пісала, зрэдку пасылала вершы ў «Полымя». Я. Купала і Уладка і ў тыя цяжкія для мяне часы сардэчна ставіліся да маёй працы,



*К. Буйло і У. Ф. Луцэвіч. 1945 г.*

ўсё разумелі». У гэты перыяд Янка Купала і Уладзіслава Францаўна не аднойчы наведвалі Маскву і падтрымлівалі Канстанцыю, аб чым яскрава сведчаць і сардэчныя аўтографы на кнігах, якія Янка Купала падараваў К. Буйло: «Дарагой мілай К. Буйло Янка Купала Масква 2/IX—34 г.» (Над ракою Арэсай. ДВБ, Мн., ЛіМ, 1934), «Мілай Костцы на мілы ўспамін Янка Масква 9/III—35г.» (Избранные стихи. М., Советская литература, 1934).

Да сярэдзіны 1940-х гадоў К. Буйло амаль не друкавалася. Вестка аб трагічнай смерці Янкі Купалы вельмі балюча адгукнулася ў сэрцы паэткі. У лісце да Уладзіславы Францаўны ад 30 чэрвеня 1942 года яна пісала: «Всем сердцем сегодня я с тобой, моя родная, бедная голубка. Целую тебя крепко, крепко обнимаю и прошу быть сильной и мужественной… Янка тоже был на фронте борьбы с фашизмом и горел огромным огнём ненависти к врагу. И сгорел на этом огне — зажигая всех и зовя на бой. Светлую память сохранят о нём потомки — а мы близкие друзья Янки навсегда сохраним к нему большую и сердечную любовь. Милая моя Владя, дорогая моя Владя! Я знаю, что ты, как никто — любила Янку, жила им — и для него, посвятила ему всю жизнь, все способности и силы. Жила его интересами, его дарованием, была ему опорой, и помощницей во всех его тревогах, волнениях и заботах. Ты оберегала его — ты ухаживала за ним — ты вдохновляла его. Я ведь очень хорошо знаю, что вся жизнь твоя была для него. Владочка, теперь переключи твою кипучую энергию на какую-нибудь работу для родной Белоруссии».

Асаблівыя адносіны былі ў К. Буйло з Уладзіславай Луцэвіч, якая і прывяла яе некалі ў «Нашу Ніву», пазнаёміла з Янкам Купалам. Буйлянка апісвала свае адносіны з Уладкай як «глыбокую і сардэчную дружбу», што доўжылася на працягу ўсяго жыцця. Уладка была для яе не проста сяброўкай, а сапраўднай сястрой, якая заўжды была гатовая прыйсці на дапамогу, падтрымаць. Асабліва гэта было заўважна ў маладосці. І Костка адказвала ёй удзячнасцю і любоўю. Яна падтрымлівала сяброўку ў самыя складаныя перыяды яе жыцця. Калі ў

1942 годзе не стала Янкі Купалы, Уладзіслава Францаўна некаторы час жыла ў яе ў Ціхвінскім завулку. А калі вярнулася ў Мінск, Костка была ў яе частым госцем. Яны вельмі часта ліставаліся. Праз Уладку К. Буйло была ў курсе ўсіх спраў на Беларусі, адчувала на радзіме сябе сваёй, ведала, што ёсць у яе тут родная душа. Балюча і няўцешна перажывала Канстанцыя Буйло смерць сяброўкі. Здарылася гэта ў 1960 годзе.

Зборнік вершаў пад назвай «Памяці друга», які Канстанцыя Буйло прысвяціла Янку Купалу, быў перададзены паэткай у Дзяржаўны літаратурны музей Янкі Купалы ў 1966 годзе (Ліст К. Буйло да дырэктара музея Янкі Шарахоўскага (Івана Захаравіча) 16/10/1966 г.). Гэта 52 старонкі машынапіснага тэксту на паперы фармату А4 з аўтарскімі праўкамі.

Зборніку папярэднічае аўтарская прадмова–ўспамін «Слова аб сабе», дзе Канстанцыя Буйло распавядае аб юнацкіх гадах (у т. л. ролі маці Уладзіславы Францаўны Луцэвіч, Эміліі Манэ, у яе першапачатковай адукацыі), сяброўстве з Уладкай Станкевічанкай, гадах вучобы і працы. Асаблівую ўвагу яна надае ролі Янкі Купалы ў сваім станаўленні як паэтэсы, яго ролі ў выданні першага зборніка «Курганная кветка». Прадмова была напісана ў жніўні 1962 года.

У падборку вершаў «Памяці друга», якая датуецца 1966 годам, аўтарка ўключыла творы, прысвечаныя Янку Купале, напісаныя ёй у розныя гады XX стагоддзя. Яе вершы поўныя любові і вялікай удзячнасці паэту, Уладзіславе Францаўне Луцэвіч і тым людзям, з якімі было звязана яе жыццё, а таксама яны апяваюць незвычайную прыгажосць прыроды роднай Беларусі. «Паэзія Канстанцыі Буйло, як лірыка адчуванняў і перажыванняў і, асабліва лірыка кахання вызначаецца непасрэднасцю ўздзеяння на пачуцці і свядомасць. Яна ясная і простая, як многія добрыя творы лірычнай паэзіі. Яе ўнутраны сэнс і прастата формы кранаюць душу», — пісаў Сцяпан Майхровіч у артыкуле «Канстанцыя Буйла» у часопісе «Маладосць» у 1946 годзе. Многія вершы паэтэсы пакладзены на музыку, асабліва шырокую вядомасць займела песня на верш К. Буйло «Люблю». Радкі з гэтага верша з'яўляюцца эпіграфам да прадмовы. Зборнік — даніна павагі і памяці паэту, а таксама своеасаблівая творчая справаздача паэткі, які так і не быў надрукаваны да гэтага часу.